Весці БДПУ. Серыя 1. 2021. № 2. С. 133–136

*УДК 821.161.3+82-31 Л. Рублеўская*

*UDC 821.161.3+82-31 L. Rubleuskaya*

# ТЫПАЛОГІЯ ЖАНОЧЫХ ВОБРАЗАЎ У ТВОРАХ Л. РУБЛЕЎСКАЙ І Д. СЭТЭРФІЛД

# TYPOLOGY OF FEMALE IMAGES IN THE WORKS BY L. RUBLEUSKAYA AND D. SETTERFIELD

**М. С. Рак,**
*аспірант кафедры беларускай і замежнай літаратуры Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка*

**M. Rak,**
*Postgraduate Student of the Department of Belarusian and Foreign Literature, Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank*

Паступіў у рэдакцыю 26.04.21.

Received on 26.04.21.

У артыкуле з дапамогай аналізу даследаванняў беларускіх і замежных літаратуразнаўцаў вылучаюцца асноўныя тыпы жаночых вобразаў і праводзіцца іх класіфікацыя. На матэрыяле аповесцей «Сэрца мармуровага анёла», «Пярсцёнак апошняга імператара» Людмілы Рублеўскай і рамана «Трынаццатая казка» Дзіяны Сэтэрфілд вызначаецца адметнасць вобразаў жанчын з пункту гледжання аўтарскага стаўлення, асаблівасцей рыс характару, сацыяльнага паходжання і сюжэтнай функцыі.

*Ключевые слова*: мастацкі вобраз, тыпалогія герояў, жаночыя вобразы, інвестыгатыўны, прэскрэптыўны, сімвалічны, атрактыўны тыпы вобраза.

With the help of analysis of research of Belarusian and Foreign literature experts the article singles out the main types of female images and makes their classification. On the material of the stories "The Heart of Marble Angel", "The Ring of The Last Emperor" by Lyudmila Rubleuskaya and the novel "The Thirteenth Tale" by Diane Setterfield the distinctiveness if the images of women from the point of view of author's attitude, peculiarities of the traits of character, social origin and plot function.

*Keywords:* artistic image, typology of characters, female images, investigative, prescriptive, symbolic, attractive types of image.

Мяжа XX–XXI стст. – надзвычай складаны перыяд у развіцці мастацтва, нездарма ў дачыненні да сучаснай культуры часта выкарыстоўваюцца паняцці, якія падкрэсліваюць неадназначную рэцэпцыю зменаў у сістэме эстэтычных каардынат: пераходны перыяд, эпоха культурнага выбуху, новая культурная сітуацыя, постмадэрнізм, неарэчаіснасць і інш. Прыгожае пісьменства нашага часу вызначаецца не толькі істотнымі зменамі ў жанрава-тэматычным, вобразным, стылёвым аспектах, але і відавочным узмацненнем цікавасці крытыкаў і літаратуразнаўцаў да гендарнага падыходу ў працэсе вывучэння мастацкіх тэкстаў. Калі ў XX ст. жаночыя вобразы «знаходзіліся» пераважна на перыферыі твораў беларускіх пісьменнікаў, «падсвечвалі» ці «адцянялі» моцныя мускулінныя характары герояў, то ў XXI ст. значна ўзрасла ў колькасных і якасных адносінах літаратура, напісаная самімі жанчынамі для жанчын і пра жанчын, у якой цэнтральнае месца займаюць каларытныя, пазбаўленыя шаблоннасці і трафарэтнасці гераіні.

Даследаваннем тыпалогіі жаночых вобразаў ва ўсходнеславянскім літаратуразнаўстве займаліся шматлікія даследчыкі, як беларускія (А. Чарнавокая [1; 2], І. Воюш [3]), так і рускія (Я. Строганава [4], А. Бярозкіна [5] і інш.), і ўкраінскія (А. Шчарбак [6], М. Кавалік [7] і інш.), што з'яўляецца ўскосным доказам узмацнення ўвагі літаратуразнаўчай супольнасці да гендарнага падыходу пры аналізе вобразнай структуры мастацкага твора.

Як адзначае беларуская даследчыца А. Чарнавокая, у прозе можна вылучыць «чатыры тыпы жаночых вобразаў: інвестыгатыўны, прэсркэптыўны, сімвалічны і атрактыўны» [2, с. 284]. Раскрыем сутнасць кожнага з іх: 1) інвестыгатыўны тып аб'ядноўвае гераінь рэалістычных твораў, носьбітаў якасцей пэўнага часу, рысы якіх сфарміраваны адметным грамадска-палітычным асяроддзем (прадстаўніцы пэўнага сацыяльнага класа, вобразы-тыпы, ахвяры, «былыя» і «новыя» жанчыны і інш.); 2) прэскрэптыўны тып прадстаўлены гераінямі, якія садзейнічаюць фарміраванню ў чытачоўрэцыпіентаў этычных і маральных імператываў, характэрных для эпохі напісання мастацкага твора (вобразы-ўзоры / прыклады і -антыўзоры / -антыпрыклады); 3) сімвалічны тып аб'ядноўвае вобразы-архетыпы (маці, жонка, нявеста і г. д.); 4) атрактыўны тып прадстаўлены жаночымі вобразамі, увага ў якіх акцэнтуецца, найперш, на любоўнай калізіі (спакусніца, ракавая жанчына). Варта адзначыць, што згаданая класіфікацыя не з'яўляецца адзіна прымальнай, існуюць і іншыя падыходы, заснаваныя на сюжэтнай функцыі вобраза, аўтарскай пазіцыі, псіхалагічных, сацыяльных і сацыяльна-гістарычных асаблівасцях персанажаў.

А. Чарнавокая на аснове аналізу прац рускіх даследчыкаў прапануе класіфікацыю тыпаў вобраза паводле: «ступені ўдзелу выяўленых асоб у падзеях і іх блізкасці да аўтара або аўтарскай зацікаўленасці: галоўныя, другасныя і толькі згаданыя персанажы <…>, ступені індывідуалізацыі "ўнутранага" аспекту: персанаж, характар, тып (псіхалагічны, сацыяльны, сацыяльна-гістарычны, нацыянальны) <…>» [1, с. 25–26]. Даследчыца ў артыкуле «Прынцыпы тыпалагізацыі літаратурных жаночых вобразаў у работах сучасных даследчыкаў» асобна вылучае вобразы апавядальніка, персанажа і носьбітаў узаемавыключальных якас-

цей [1, с. 26], а таксама звяртае ўвагу на класіфікацыю персанажаў В. Пропа, удасканаленую Ц. Тодаравым і А.-Ж. Грэймасам, паводле якой вылучаюцца суб’ект, аб’ект, адрасат, сапернік [8].

У сваім даследаванні мы будзем выкарыстоўваць класіфікацыю літаратурных вобразаў жанчын з пункту гледжання: 1) аўтарскага стаўлення (станоўчая / адмоўная гераіня); 2) вызначэння рыс характару, сацыяльнага паходжання і прафесійнай прыналежнасці (лётуценніца, ахвяра, ракавая жанчына, муза, арыстакратка, філолаг, мастацтвазнаўца, біёграф і інш.); 3) сюжэтнай функцыі (галоўны / другарадны вобраз). Матэрыялам даследавання з’яўляюцца аповесці Людмілы Рублеўскай «Сэрца мармуровага анёла», «Пярсцёнак апошняга імператара» і раман Дзіяны Сэтэрфілд «Трынаццатая казка».

У аснове твораў беларускай пісьменніцы знаходзіцца адкрыццё таямніцы, якая становіцца своеасаблівым кампазіцыйным лейтматывам і знітоўвае паміж сабой герояў. Большасць жаночых вобразаў Л. Рублеўскай – цэнтральныя, да таго ж станоўчыя дзяўчыны, гуманітарыі па адукацыі, якія вядуць адлік свайго роду са старадаўніх часоў і становяцца выразнікамі аўтарскай пазіцыі пра ролю гісторыі для сучаснасці, пра адказнасць кожнага пакалення і за мінулае, і за будучыню. Да прыкладу, Магда Дарбут з аповесці «Пярсцёнак апошняга імператара», аказваецца спадчынніцай аднаго з нашчадкаў візантыйскага імператара з роду Палеалогаў, які ахвяруе сваім жыццём, не скарыўшыся ворагам-захопнікам.

Аповесці «Пярсцёнак апошняга імператара» і «Сэрца мармуровага анёла» – сінкрэтычныя жанравыя поліформы, пабудаваныя на аснове спалучэння сутнасных характарыстык жанраў масавай літаратуры – дэтэктыва, містыкі, прыгод і меладрамы. Іх сюжэтным стрыжнем з’яўляецца незвычайная таямніца, звязаная з лёсам галоўнай гераіні, вакол раскрыцця якой і разгортваецца дзеянне, што падкрэслівае сувязь названых твораў з дэтэктывам, які заўсёды трымаецца на такіх элементах сюжэта, як пошук, расследаванне, раскрыццё.

Сістэма персанажаў у «Пярсцёнку апошняга імператара» і «Сэрцы мармуровага анёла» пабудавана ў адпаведнасці з дэтэктыўнапрыгодніцкай дамінантай твораў. Рамантычнавытанчаная гераіня-муза, высакародны герой, герой-злодзей, кожны з якіх выконвае нязменную функцыю: шляхетная прыгажуня трапляе ў небяспечныя незвычайныя гісторыі, паступова становіцца больш дзейснай і актыўна ўдзельнічае ў пераадоленні выпрабаванняў лёсу, мужны і годны герой дапамагае з іх выходзіць, герой-злодзей стварае разнастайныя перашкоды.

Л. Рублеўская з вялікай сімпатыяй стварае мастацкія вобразы сваіх гераінь, акцэнтуючы ўвагу на такіх іх рысах, як незалежнасць, жаноцкасць, унутраная разняволенасць, адчуванне самакаштоўнасці, жаданне і ўменне дасягнуць пастаўленай мэты. Гэта «жанчыны творчых прафесій, захопленыя сваёй справай, што адразу ж вызначае ці, дакладней, падкрэслівае дамінаванне “духоўнага пачатку” ў вобразах гераінь: у аповесці “Сэрца мармуровага анёла” – мастацтвазнаўца Кацярына (Кася), у аповесці “Пярсцёнак апошняга імператара” – пісьменніца Магдаліна (Магда). Усе – самаіранічныя прыгажуні з “неўладкаваным лёсам” (што дае падставы для меладраматычных адгалінаванняў у сюжэтах), і ўсе – гэткія “папялушкі-пакутніцы”, якім нягледзячы на прыроджаныя здольнасці і ўсялякія таленты штосьці “ўхвальна-высакароднае” (бескампрамісны характар, непадкупнасць, праўдалюбства і г. д.) перашкодзіла зрабіць бліскучую кар’еру, дасягнуць матэрыяльнага дабрабыту і асабістага шчасця» [9, с. 190]. Такім чынам, гэта жанчыны адукаваныя, інтэлектуальныя, добра выхаваныя, але ў дадзены момант нешчаслівыя ў асабістым жыцці, прыгажуні, якія імкнуцца разгадаць таемную энігму, звязаную з іх асабістым лёсам, і прыйсці ў выніку пошукаў да сапраўднага кахання.

На тыпалогію гераінь названых аповесцей Л. Рублеўскай наклаў адбітак авантурнадэтэктыўны пачатак, а таксама меладраматычныя элементы, звязаныя з сюжэтнай лініяй кахання, заключанай у формуле «любоўнага трохкутніка» (Магда – Марк – Кастусь у «Пярсцёнку апошняга імператара», Кася – Вінцук – Вера ў «Сэрцы мармуровага анёла»), якая нязменна прысутнічае ў абсалютнай большасці твораў пісьменніцы.

Адным са спосабаў ажыццяўлення пісьменніцкай стратэгіі ў згаданых аповесцях становіцца стылёвая рамантызацыя і асучасніванне гераінь: жанчыну можа ўпрыгожваць не толькі модная вопратка, але і не дужа ахайныя джынсы і мужчынская кашуля (Магда з аповесці «Пярсцёнак апошняга імператара»), якія не пазбаўляюць яе жаноцкасці і хараства. Гераіні Л. Рублеўскай заўсёды застаюцца вернымі сабе ў самых складаных сітуацыях, не здраджваюць памяці і гонару сваіх слаўных прашчураў, не шукаюць простых шляхоў і не спыняюцца напаўдарозе да сваёй мэты (разгадка таямніцы). Так, Кася і Магда «гатовыя рызыкаваць жыццём дзеля выратавання пакрыўджанага і зняважанага генія – мастака Вінцука, гісторыка Кастуся. А мужчыны дзякуючы дабратворным флюідам шырокай жаночай душы ва ўсіх творах праходзяць эвалюцыйны шлях ад “брыдкага качаняці” да “чароўнага лебедзя” (варыянт: ад “пачварнага страшыдлы” да “прыгожага прынца”)» [9, с. 191].

Такім чынам, у аповесцях Л. Рублеўскай «Сэрца мармуровага анёла», «Пярсцёнак апошняга імператара» вобразы жанчын з'яўляюцца цэнтральнымі, гэта сюжэтастваральныя персанажы, рамантызаваныя дзяўчаты творчых прафесій (журналісткі, пісьменніцы, мастацтвазнаўцы), якія ахвяруюць асабістымі памкненнямі дзеля раскрыцця таямніцы, так званыя жанчыны з «гарачым сэрцам», якія вызначаюцца хараством аблічча і багаццем унутранага свету.

Тыпалогія жаночых персанажаў Дзіяны Сэтэрфілд у рамане «Трынаццатая казка» абумоўлена жанравай спецыфікай твора – гэта гатычны раман, у якім падзеі разгортваюцца ў напаўразбураных будынках і змрочных месцах (замках, на могілках, халодных пустках, закінутых дамах і г. д.), літаральна наскрозь прасякнутых атмасферай вусцішнасці. У адрозненне ад аповесцей беларускай пісьменніцы, разгорнутая структура рамана дазваляе англійскаму аўтару засяроджваць увагу на некалькіх сюжэтных лініях і дамінантных (цэнтральных) вобразах, якія з'яўляюцца хутчэй не сюжэтастваральнымі, а кампазіцыйнымі кампанентамі. Гатычная скіраванасць твора садзейнічае ўзнікненню адрозных ад вобразаў Л. Рублеўскай персанажаў – гэта  жанчыны з паламаным або нешчаслівым лёсам, жанчыны-ахвяры ці ракавыя прыгажуні, жыццё якіх абрываецца ў выніку цяжкіх хвароб (у тым ліку псіхічных), няшчасных выпадкаў ці наўмыснага забойства. Зазначым, што вобразы жанчын рамана Д. Сэтэрфілд тыпалагічна блізкія да сістэмы персанажаў класічнага англійскага рамана Ш. Брантэ «Джэйн Эйр».

Як ужо адзначалася, раман «Трынаццатая казка» напісаны ў поўнай адпаведнасці з гатычнай традыцыяй: наяўнасць гатычнага дома з мноствам таямніц, у якім жыве знакамітая пісьменніца Віда Вінтэр; зарослы сад, дзе галоўная гераіня-біёграф – Маргарэт Лі – нібыта сустракаецца з прывідам, а на самой справе з сапраўднай дачкой гаспадароў маёнтка; знікненне і смерць, вар'яцтва і кровазмяшэнне ў сям'і, вакол якой разгортваюцца падзеі (Чарлі, Ізабэла, Эстэр і інш.); вогнішчы і пажары (Анджэлфілд-Хаўс); цёмныя, дажджлівыя ночы, якія прымушаюць гераінь разважаць пра свой лёс і інш.

Адным з ключавых прыёмаў аповеду Д. Сэтэрфілд з'яўляецца такая наратыўная стратэгія, як «кніга ў кнізе»: падзеі аспісваюцца з пункту гледжання Маргарэт Лі, якая складае біяграфію знакамітай пісьменніцы Віды Вінтэр, непасрэдна Віды, якая распавядае сямейную гісторыю і раскрывае таямніцу свайго паходжання, а таксама праз дзённік былой гувернанткі Эстэр, якая выхоўвала дзяцей у маёнтку Анджэлфілд-Хаўс, і апавядання Аўрэліўса (нашчадак гаспадароў маёнтка) пра яго незвычайнае з'яўленне ў прыёмнай маці.

Як і ў прозе Л. Рублеўскай, галоўнай гераіняй рамана англійскай пісьменніцы з'яўляецца філолаг. Маргарэт Лі, біёграф па прафесіі, жыве ў свеце кніг, размешчаных у букіністычнай краме бацькі. Безумоўна, гэта цэнтральны і станоўчы жаночы вобраз. Маргарэт тлумачыць сваё ненатольнае жаданне чытаць кнігі імкненнем захаваць памяць пра памерлых: «Паміраючы, людзі знікаюць. Знікаюць іх голас, іх смех, цеплыня іх дыхання. Знікае іх плоць, а ўрэшце рэшт і косці. Знікае і памяць аб гэтых людзях. Гэта жахліва і ў гэты ж час натуральна. Аднак у некаторых людзей атрымліваецца пазбегнуць бясследнага знікнення, бо яны працягваюць існаваць у створаных імі кнігах. Мы можам нанова адкрыць іх» [10, с. 25–26]. Маргарэт не проста жанчына гуманітарнай прафесіі, яна становіцца ўвасабленнем пошуку адказаў на пытанні, якія турбуюць не толькі яе, але і пісьменніцу Віду Вінтэр. Гэтыя два цэнтральныя вобразы перасякаюцца не толькі з-за напісання мемуараў, але і маюць пэўнае падабенства ў лёсе: біёграф знакамітай пісьменніцы ў дзяцінстве страціла сястру, пра што нагадвае толькі шрам на целе і знойдзенае пасведчанне аб нараджэнні («Я падцягнула край швэдара і павярнулася да яе правым бокам. Мой шрам. Мой паўмесяц <…> Яна была тут. У гэтым месцы мы з ёй злучаліся. Але нас раз'ядналі. І яна памерла. Яна не змагла жыць асобна ад мяне» [10, с. 391]); Вінда таксама мае таямніцу, звязаную з нараджэннем – яна выдае сябе за адну з дачок былых уладальнікаў Анджэлфілд-Хаўса, а на самой справе з'яўляецца пазашлюбным дзіцём аднаго з іх.

Галерэя другарадных гераінь у рамане Д. Сэтэрфілд прадстаўлена рознымі па сваёй сутнасці вобразаў, якія ўяўляюць супрацьлеглыя тыпы: 1) ракавыя жанчыны, дэманічныя па сваёй сутнасці, якія руйнуюць усё, што знаходзіцца побач (Ізабэла, якая прагне толькі фізічнага задавальнення і не звяртае ўвагу на перашкоды, што замінаюць ёй атрымаць жаданае; адна з яе дачок-блізнят Адэліна, якая спальвае сямейны маёнтак); 2) жанчыны, якія ахвяруюць сабой дзеля сям'і, нават чужой (старая служка сям'і Анджэлфілдаў Місіз); 3) жанчыны-ахвяры, якія губляюць усё (сястра Адэліны Эмеліна, якая нарадзіла дзіця і страціла яго падчас пажару, а праз доўгі час даведалася, што яго выратавалі); 4) жанчыны-выхавацелі (былая гувернантка Анджэлфілдаў Эстэр, якая на непрацяглы час спарадкавала жыццё ў «праклятым» маёнтку).

Важным для вызначэння тыпалогіі герояў у рамане Д. Сэтэрфілд з'яўляецца тое, што жаночыя вобразы, нягледзячы на кардынальнае адрозненне, аб'яднаны наступнымі паказ-

чыкамі: 1) незвычайны лёс ці наяўнасць неразгаданай сямейнай таямніцы, якая паступова адкрываецца (выпадкова ці з дапамогай споведзі): у Маргарэт Лі была сястра, якая памерла толькі нарадзіўшыся, а Віда Вінтэр заняла месца адной з блізнят Анджэлфілдаў, якая загінула падчас пажару ў маёнтку; 2) незвычайная знешнасць: яркія валасы, зялёныя вочы ў жанчын з роду Анджэлфілдаў; 3) моцны характар: пераадоленне неверагоднага болю Відай Вінтэр; жаданне атрымаць ад жыцця ўсе асалоды ў Ізабэлы Анджэлфілд; 4) большасць з іх заканчваюць жыццё ў страшных пакутах, выключэннем з'яўляецца вобраз Маргарэт Лі.

Такім чынам, у адрозненне ад аповесцей Л. Рублеўскай, галерэя жаночых вобразаў у рамане Д. Сэтэрфілд «Трынаццатая казка» больш разнастайная, прадстаўлена дыяметральна супрацьлеглымі тыпамі, што абумоўлена жанравай спецыфікай гатычнага рамана. Менавіта гатычная скіраванасць аўтарскай стратэгіі прывяла да з'яўлення вобразаў, у якіх аб'ядноўваюцца супрацьлеглыя рысы і якасці (дабро і зло, помста і ахвяра, знешняя прыгажосць і душэўная пачварнасць).

*Літаратура*


1. *Чарнавокая, А. М.* Прынцыпы тыпалагізацыі літаратурных жаночых вобразаў у работах сучасных даследчыкаў / А. М. Чарнавокая // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия А, гуманитарные науки. – 2018. – № 10. – С. 25–32.
2. *Чарнавокая, А. М.* Тыпалогія жаночых вобразаў у беларускай прозе першай паловы ХХ ст. // Мова і літаратура ў ХХІ стагоддзі: актуальныя аспекты даследавання : матэрыялы V Рэсп. навук. практ. канф. маладых вучоных, Мінск, 22 сак. 2019 г. / Беларус. дзярж. ун-т ; рэдкал.: В. У. Зуева (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУ, 2019. – С. 283–287.
3. *Воюш, І. Д.* Трансфармацыя вобраза жанчыны ў беларускай прозе ХХ стагоддзя : дыс. ... канд. філал. навук : 10.01.01 / І. Д. Воюш. – Мінск : БДУ, 2004. – 111 л.
4. *Строганова, Е.* Категория «гендер» в изучении истории русской литературы / Е. Строганова // Пути и перспективы интеграции гендерных методов в преподавание социально-гуманитарных дисциплин : материалы науч. конф. – Тверь, 2000. – С. 32–37.
5. *Березкина, Е. П.* Типология женских образов в народническом романе (на материале творчества Н. А. Арнольди, С. И. Смирновой, Н. Д. Хвощинской, О. А. Шапир) : автореф. дис. … канд. филол. наук : 10.01.01 / Е. П. Березкина ; Бурятский гос. ун-т. – Улан-Удэ, 2004. – 26 с.
6. *Щербак, О. В.* Типологія жіночих образів у давній українській літературі : дис… канд. філол. наук : 10.01.01 / О. В. Щербак. – Житомір, 2016. – 188 л.
7. *Ковалик, М. О.* Типологія жіночих характерів у прозі та драматургії Володимира Винниченка : автореф. дис. … канд. філол. наук : 10.01.01 / М. О. Ковалик ; Кіровоградський державний педагогічний університет імені Володимира Винниченка. – Кіровоград, 2007. – 24 с.
8. *Греймас, А.-Ж.* Структурная семантика / А.-Ж. Греймас. – М. : Академический проект, 2004. – 367 с.
9. *Алейнік Л. В.* Масавая літаратура: сябар ці вораг? / Л. В. Алейнік // Пясочны гадзіннік : літ.-крытыч. артыкулы, нарысы, рэцэнзіі, нататкі. – Мінск : Літаратура і Мастацтва, 2010. – С. 186–193.
10. *Сеттерфилд, Д.* Тринадцатая сказка : роман / Д. Сеттерфилд ; пер. с англ. В. Дорогокупли. – СПб : Азбука, Азбука-Аттикус, 2021. – 448 с.


*References*


1. *Charnavokaya, A. M.* Pryncypy typalagizacyi litaraturnyh zhanochyh vobrazau u rabotah suchasnyh dasledchykau / A. M. Charnavokaya // Vestnik Polockogo gosudarstvennogo universiteta. Seriya A, gumanitarnye nauki. – 2018. – № 10. – S. 25–32.
2. *Charnavokaya, A. M.* Typalogiya zhanochyh vobrazau u belaruskaj proze pershaj palovy HH st. // Mova i litaratura u XXI stagoddzi: aktual'nyya aspekty dasledavannya : materyyaly V Resp. navuk. prakt. kanf. maladyh vuchonyh, Minsk, 22 sak. 2019 g. / Belarus. dzyarzh. un-t ; redkal.: V. U. Zueva (adk. red.) [i insh.]. – Minsk : BDU, 2019. – S. 283–287.
3. *Voyush, I. D.* Transfarmacyya vobraza zhanchyny u belaruskaj proze HH stagoddzya : dys. ... kand. filal. navuk : 10.01.01 / I. D. Voyush. – Minsk : BDU, 2004. – 111 l.
4. *Stroganova, E.* Kategoriya «gender» v izuchenii istorii russkoj literatury / E. Stroganova // Puti i perspektivy integracii gendernyh metodov v prepodavanie social'no-gumanitarnyh disciplin : materialy nauch. konf. – Tver', 2000. – S. 32–37.
5. *Berezkina, E. P.* Tipologiya zhenskih obrazov v narodnicheskom romane (na materiale tvorchestva N. A. Arnol'di, S. I. Smirnovoj, N. D. Hvoshchinskoj, O. A. Shapir) : avtoref. dis. … kand. filol. nauk : 10.01.01 / E. P. Berezkina ; Buryatskij gos. un-t. – Ulan-Ude, 2004. – 26 s.
6. *Shcherbak, O. V.* Tipologiya zhinochih obraziv u davnij ukraïns'kij literaturi : dis… kand. filol. nauk : 10.01.01 / O. V. Shcherbak. – Zhitomir, 2016. – 188 l.
7. *Kovalik, M. O.* Tipologiya zhinochih harakteriv u prozi ta dramaturgii Volodimira Vinnichenka : avtoref. dis. … kand. filol. nauk : 10.01.01 / M. O. Kovalik ; Kirovograds'kij derzhavnij pedagogichnij universitet imeni Volodimira Vinnichenka. – Kirovograd, 2007. – 24 s.
8. *Grejmas, A.-Zh.* Strukturnaya semantika / A.-Zh. Grejmas. – M. : Akademicheskij proekt, 2004. – 367 s.
9. *Alejnik L. V.* Masavaya litaratura: syabar ci vorag? / L. V. Alejnik // Pyasochny gadzinnik : lit.-krytych. artykuly, narysy, recenzii, natatki. – Minsk : Litaratura i Mastactva, 2010. – S. 186–193.
10. *Setterfield, D.* Trinadcataya skazka : roman / D. Setterfield ; per. s angl. V. Dorogokupli. – SPb : Azbuka, Azbuka-Attikus, 2021. – 448 s.